# Шлях да навуковых і творчых вяршынь



Рэдакцыя часопіса «Мастацкая адукацыя і культура» далучаецца да віншавання нашага калегі Рыгора Фёдаравіча Шауры з нагоды зацвярджэння Прэзідыумам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь яго доктарскай дысертацыі «Развіццё народнага выяўленчага мастацтва Беларусі канца XVIII — пачатку XXI ст.: гісторыка-тэарэтычны аспект» і прысвойвання яму вучонай ступені доктара мастацтвазнаўства.

Прафесар Р. Ф. Шаура працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў з 1977 года. Ён — вопытны і высокакваліфікаваны педагог і навуковец. У 1990 годзе ўпершыню на прасторы былога Савецкага Саюза ў Мінскім інстытуце культуры ім была створана спецыялізацыя «народныя рамёствы», а некалькі пазней — кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якую ён узначальваў на працягу 15 гадоў. За гэты час кафедра вырасла ў моцную і аўтарытэтную адукацыйную і выхаваўчую структуру. Маючы вялікую запатрабаванасць у кадрах для сферы народных промыслаў і рамёстваў, адукацыі і выхавання ў маштабах рэспублікі, калектыў кафедры сканцэнтраваў усе намаганні на падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў на дзённай і завочнай формах навучання. Пад кіраўніцтвам Рыгора Фёдаравіча кафедра падрыхтавала звыш 400 спецыялістаў, якія паспяхова працуюць ва ўстановах культуры і адукацыі Беларусі. На працягу 2002–2006 гг. звыш 50 выхаванцаў сталі лаўрэатамі Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Многія з іх потым сталі членамі Беларускага саюза мастакоў, Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, лаўрэатамі міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў у розных намінацыях выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вялікая заслуга ў гэтым належыць Рыгору Фёдаравічу як педагогу і выхавацелю маладога пакалення.

*Працяг на с. 33, 49.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ





*Окончание таблицы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| 34 | Завершение работы | 1 | | ***Цель урока:*** формировать умение завершать работу.<br>***Задачи урока:***<br>– формирование умения детальной проработки предметов;<br>– совершенствование навыка выделения переднего плана;<br>– формирование навыка целостного восприятия натюрморта;<br>– совершенствование навыка обобщения |
| **Тема 8. Весенний этюд городского пейзажа (1 ч)** | | | | |
| 35 | | 1 | А3, акварель | ***Цель урока:*** актуализировать знания об особенностях изображения пейзажа.<br>***Задачи урока:***<br>– формирование представлений о композиции пейзажа;<br>– актуализация представлений о значении освещённости в пейзаже;<br>– формирование навыков передачи объёма и пространства с помощью цвета и тона;<br>– развитие представлений о влиянии световоздушной среды на передачу глубины изображения;<br>– развитие способности целостного видения;<br>– формирование навыка выявления композиционного центра;<br>– развитие умения подчинять мелкие детали общей форме;<br>– формирование навыков выявления переднего плана с помощью тонового контраста;<br>– развитие умения обобщать и завершать работу |

***Е. С. Бронская****, учитель высшей категории средней школы № 185 г. Минска;*
***А. С. Трусова****, учитель высшей категории средней школы № 185 г. Минска*

*Пачатак на с. 2 вокладкі.*

За апошні час прафесар распрацаваў і выдаў шмат вучэбнай і нарматыўна-метадычнай дакументацыі: вучэбныя праграмы «Малюнак» (1995, 2008), «Самадзейнае і народнае мастацтва» (1996), «Перспектыва ў выяўленчым мастацтве» (2004); вучэбныя дапаможнікі «Перспектыва ў малюнку і жывапісе» (2003) і «Малюнак у навучальным працэсе» (2005). Не аднойчы Рыгор Фёдаравіч з'яўляўся распрацоўшчыкам стандартаў вышэйшай адукацыі па спецыялізацыях «народная творчасць» і «дэкаратыўнае мастацтва», а таксама вучэбных планаў спецыялізацый «народныя рамёствы» і «рэстаўрацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва».

Разам з тым ён паспяхова ажыццяўляе кіраўніцтва кандыдацкімі, магістарскімі дысертацыямі, студэнцкімі навуковымі і дыпломнымі работамі, выконвае рэцэнзаванне навуковых манаграфій, артыкулаў, дысертацыйных даследаванняў, выступае апанентам пры абмеркаванні і абароне кандыдацкіх дысертацый.

Плённая навуковая дзейнасць Р. Ф. Шауры сведчыць пра надзвычай шырокае кола яго інтарэсаў, сярод якіх праблемы мастацкай, педагагічнай і культуралагічнай адукацыі, развіцця асноў шматузроўневай сістэмы вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Рыгорам Фёдаравічам апублікавана звыш 80 навуковых прац, сярод якіх 7 манаграфій, 68 артыкулаў у замежных і рэспубліканскіх навуковых выданнях. Найбольш вядомыя з іх «Пейзаж у беларускім жывапісе» (1982), «Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі» (1995), «Развіццё народнага і дэкаратыўнага мастацтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XXI ст.» (2006), «Гаўрыіл Харытонавіч Вашчанка» (1978), «Міхась Засінец» (1981), «Леанід Дударанка» (1984), «Альгерд Малішэўскі» (1988) і інш.

*Працяг на с. 49.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Окончание таблицы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| 34 | Работа в тоне | 1 | | ***Цель урока:*** формировать навыки передачи материальности с помощью светотени и штриховки. ***Задачи урока:*** – формирование представлений о влиянии блика и рефлекса на выявление объёма и материальности предметов; – формирование представлений о методе сравнения; – актуализация представлений о влиянии воздушной среды на передачу материальности и объёма предметов |
| 35 | Завершение. Обобщение | 1 | | ***Цель урока:*** формировать умение завершать работу в тоне. ***Задачи урока:*** – формирование умения анализировать тональные отношения в процессе ведения работы; – развитие представлений о тональных нюансах и контрастах для передачи плановости в рисунке; – формирование представлений о тональном единстве натюрморта; – формирование навыка работы от общего к частному и от частного к общему |

***Е. С. Бронская**, учитель высшей категории средней школы № 185 г. Минска;*
***А. С. Трусова**, учитель высшей категории средней школы № 185 г. Минска*

*Пачатак на с. 2 вокладкі, с. 33.*

Р. Ф. Шаура пастаянна працуе над павышэннем сваёй кваліфікацыі, прымае актыўны ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх, вузаўскіх навуковых канферэнцыях, семінарах.

З 2001 года Рыгор Фёдаравіч узначальвае навукова-творчую лабараторыю «Традыцыйныя рамёствы беларусаў», якая пад яго кіраўніцтвам праводзіць актыўную даследчыцкую работу па адраджэнні, аднаўленні і трансляцыі ў сучасную мастацкую культуру забытых і страчаных тэхнік і тэхналогій народнага традыцыйнага мастацтва. Калектыў навукова-творчай лабараторыі пастаянна ажыццяўляе шматлікія экспедыцыйныя паездкі па разнастайных рэгіёнах Беларусі, знаходзіць унікальныя рэчы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія потым становяцца надзвычай каштоўным матэрыялам для навуковых абагульненняў і навучальнага працэсу. За апошні час супрацоўнікамі навукова-творчай лабараторыі выдадзены грунтоўныя навуковыя працы – манаграфіі «Развіццё народнага выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XXI ст.» і «Тэкстыль Сярэднявечча на землях Беларусі».

Акрамя навуковай і педагагічнай дзейнасці Рыгор Фёдаравіч паспяхова займаецца акварэльным жывапісам. Ён з'яўляецца сябрам Беларускага саюза мастакоў. Творы Рыгора Фёдаравіча пранікнуты вялікай любоўю да роднага краю, тых мясцін, дзе ён нарадзіўся, дзе прайшлі яго дзяцінства і юнацтва, адкуль і пачаўся шлях у вялікае творчае жыццё. Характэрнай асаблівасцю большасці акварэльных пейзажаў мастака з'яўляецца тое, што ў кожным з іх праглядваюцца матывы роднай Лепельшчыны з яе шматлікімі азёрамі, рачулкамі і пералескамі, так паэтычна, узнёсла і душэўна апетыя ў чыстых, празрыстых фарбах. Менавіта пастаянная сувязь з роднымі мясцінамі, сустрэчы з землякамі даюць Рыгору Фёдаравічу жыватворнае натхненне на новыя здзяйсненні ў творчай, навуковай і педагагічнай дзейнасці. Высокі прафесіяналізм, адданасць сваёй справе, карэктнасць у адносінах да людзей, камунікабельнасць забяспечылі яму заслужаны аўтарытэт сярод калег, сяброў і студэнтаў.

***Георгій Лойка**, галоўны рэдактар*
*часопіса «Мастацкая адукацыя і культура»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ